# АРБАЛЕТНЫЯ БАЛТЫ З ГАРАДЗІШЧА І СЕЛІШЧА ПРУДНІКІ

***канд. гіст. навук У.А. ПЛАВІНСКІ, В.І. ШАДЫРА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

Гарадзішча і селішча Пруднікі знаходзяцца на беларуска-латышскім памежжы на левым беразе р. Вяты за 1,5 км ад Заходняй Дзвіны, за 10 км вышэй гарадскога пасёлка Друя. Гарадзішча размешчана за 0,25 – 0,5 км на поўнач ад вёскі Пруднікі Міёрскага раёна, на стромкім высокім (20 м) ўзгорку. Яно вядомае пад назвай «Замак». Пляцоўка гарадзішча мае форму няправільнага авала, з ухілам у бок ракі памерамі 118 × 50 м. Селішча займае спадзістае ўзвышша авальнай формы (67 × 35 м) вышынёй 2 – 2,5 м. Культурныя слаі гарадзішча ўтрымліваюць матэрыялы V – XVII стст., селішча функцыянавала з V па XI ст.

З узгадванняў Пруднікаў у сярэднявечных гістарычных крыніцах, можна адзначыць прывілей, выдадзены ў 1522 г. Яну Сапеге на ўзнаўленне фартэцыі на Вяце [34, s. 416]. Фартэцыя на Вяце і ёсць гарадзішча «Замак». Таксама Сігізмунд Герберштейн у сваіх «Запісках пра Масковію» адзначыў горад Вята [3, с. 385].

Пачатак сістэматычнаму вывучэнню Пруднікаў быў пакладзены А.Р. Мітрафанавым у 1974 г. У 1978 – 1982 ім былі праведзены раскопкі на селішчы. Аднак асноўныя даследаванні археалагічнага комплексу былі праведзены В.І. Шадырам. Пад яго кіраўніцтвам раскопкі адбываліся ў 1977 г., а з 1983 па 1999 – штогод.

За гады даследаванняў сабрана найбагацейшая калекцыя артэфактаў самага разнастайнага характару. Вялікую цікавасць уяўляе сабой калекцыя зброі далёкага бою, у прыватнасці наканечнікі стрэл лука і арбалета, якіх выяўлена каля 130 адзінак. Прапанаваны артыкул прысвечаны разгляду знаходак наканечнікаў стрэл арбалета (арбалетных балтоў).

Элементы зброі далёкага бою з Пруднікаў знаходзілі адлюстраванне ў шэрагу публікацый [13, с. 47 – 57; 26, с. 138 – 146; 29, с. 267 – 274; 20]. Знаходкам стрэл з Пруднікаў быў прысвечаны асобны артыкул Г.В. Ласкавага і В.І. Шадыры [27, 1994, с. 217 – 224]. Разам з тым, узровень вывучанасці пытанняў, звязаных з выкарыстаннем арбалета на тэрыторыі Усходняй Еўропы, з'яўленне новых публікацый ствараюць умовы для больш дэталёвага разгляду пруднікаўскіх матэрыялаў. Такім чынам паўстае неабходнасць яшчэ раз звярнуцца да знаходак арбалетных балтоў з гарадзішча і селішча Пруднікі.

Агульная колькасць знойдзеных у Прудніках балтоў – 41 (36 – гарадзішча, 5 – селішча). Разгледзім тыпалагічную прыналежнасць наканечнікаў (тыпы прыводзяцца згодна з тыпалогіяй А.Ф. Мядзведзева [16, с. 93 – 96], у дужках пазначаны тыпы згодна з Г. Рацкевічусам [35, s. 285 – 286]):

**Тып 1 (1*)** – утулкавыя пірамідальныя балты квадратнага сячэння з шыйкай (мал. 1:1; 1 экз.). Згодна з тыпалогіяй А.Ф. Мядзведзева, наканечнік належыць да ранняй разнавіднасці тыпу XII–XIII стст. [16, с. 94]. Згодна з Г. Рацкевічусам, падобныя наканечнікі ў Літве датуюцца першай паловай XIII ст. [35, s. 283]. Ніжняя частка пруднікаўскага экзэмпляру абламаная.

**Тып 8 (9*)** – лаўралістныя рамбічнага сячэння (мал 2:2; 1 экз.). Наканечнік належыць да першай разнавіднасці тыпу, якая датуецца XIII–XIV стст. [16, с. 94].

**Тып 14 (15*)** – квадратнага сячэння з ромбападобнай гранню (мал. 1:3 – 11; 9 экз.). Усе экзэмпляры дадзенага тыпу паходзяць з гарадзішча, са слаёў з канструкцыямі вала. Тып мае даволі шырокія храналагічныя межы выкарыстання. А.Ф. Мядзведзеў датаваў яго канцом XII – пачаткам XV ст. [16, с. 95]. Шмат падобных балтоў паходзіць з раскопак гарадзішчаў і замкаў Літвы, дзе яны датуюцца XIII – першай паловай XVI ст. [6, с. 140; 35, s. 283]. Таксама шмат наканечнікаў гэтага тыпу знойдзена на тэрыторыі сучаснай Латвіі, Польшчы, якія так ці інакш былі звязаны з ваеннай актыўнасцю крыжакаў. Аналагічныя наканечнікі сустракаюцца на захадзе сучаснай Беларусі: у Ваўкавыску (3 экз; слаі XIII – XIV стст. [9, с. 168]), Гродна (3 экз, слаі др. п. XIV ст. [9, с. 168]), Наваградку [4, с. 172], Брэсце [15, с. 223] ды інш. Акрамя таго, па аднаму балту тыпу 14 знойдзены на суседнімі з Пруднікамі гарадзішчах Замкавая гара ў Браславе і Маскавічы [1, рис. 46:10; 5, мал. 22: 5].

**Тып 15 (14*)** – квадратнага сячэння з рамбападобнай гранню і зрэзанымі вугламі. (мал. 1:12 – 17, мал. 2:1 – 11; 18 экз.). Падобны да тыпу 14. Распаўсюджаны прыкладна на тых жа тэрыторыях і ў той жа храналагічны перыяд, што і тып 14. Шмат падобных наканечнікаў паходзіць з Літвы, са слаёў XIII – першай паловай XVI ст. [6, с. 140; 35, s. 283], Латвіі, са слаёў XIII ст. (гарадзішчы Асотэ [30, с. 46], Межонтэ, Велідона [16, с. 95], Герсіка [37, tab 14:9 – 11] і інш.), Польшчы. На тэрыторыі Беларусі яны знойдзены, таксама як і балты тыпу 14, у Ваўкавыску, Гродна [9, с. 168], Наваградку [4, с. 172], Брэсце [15, с. 223], Полацку [31, рис. 30:7], Мінску [7, табл. X:3], Заслаўі [8, рис. 40:16].

**Тып 16 (18*)** – рамбічнага сячэння з рамбападобнай гранню і зрэзанымі вугламі. (мал. 2:12 – 14; 3 экз.). Адрозніваецца ад тыпу 15 толькі сячэннем. Ідэнтычны з тыпамі 14 і 15 у аспекце храналогіі і аналогій. Два аналагічных наканечнікі паходзіць з суседняга Маскавіцкага гарадзішча [13, рыс. 3:8, 10].

**Тып 16*** – біпірамідальныя квадратнага сячэння з круглай шыйкай (мал. 2:15–19; 5 экз.). У тыпалогіі балтоў А.Ф. Мядзведзева падобныя экзэмпляры не знайшлі адлюстравання. Але яны сустракаюцца на тэрыторыі Літвы, Латвіі. Храналагічныя межы выкарыстання тыпа аналагічныя з тыпамі 14 і 15. Аналагічны наканечнік паходзіць з раскопак Л.В. Аляксеева на гарадзішчы Замкавая гара ў Браславе (захоўваецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, КП 12516/10).



Мал. 1. Арбалетныя балты з гарадзішча і селішча Пруднікі: 1 – тып 1, 2 – тып 8, 3 – 11 – тып 14, 12 – 17 – тып 15. *(12, 13 – селішча)*



Мал. 2. Арбалетныя балты з гарадзішча і селішча Пруднікі: 1 – 11 – тып 15, 12 – 14 – тып 16, 15 – 19 – тып 16* *(18, 19 – селішча)*

***нумары ў дужках адпавядаюць нумарам у каталозе***

Усе тыпы балтоў, рэпрэзентаваныя ў напластаваннях гарадзішча Пруднікі, прынята лічыць па большасці крыжацкімі. Менавіта балты тыпаў 14 і 15 з'яўляюцца звычайнай знаходкай у Літве, Латвіі, Польшчы, на гарадзішчах, якія спазналі крыжацкія наезды, альбо якія былі базамі рыцараў. Неабходна заўважыць, што большасць пруднікаўскіх балтоў не прысадзістыя па сваіх прапорцыях, хаця ёсць і такія. Існуе шэраг меркаванняў адносна сувязі прапорцый чаршковых балтоў і перыяду іх выкарыстання. Так, у XIV ст. форма такіх балтоў становіцца больш прысадзістай. Прынамсі чарашковыя балты тыпаў 14 і 15, аналагічныя па прапорцыям пруднікаўскім, можна знайсці, напрыклад, сярод знаходак самага буйнога і найлепш даследаванага гарадзішча усходняй Літвы – Шайміншкеляй. Вялікая колькасць такіх балтоў апынулася ў напластаваннях гарадзішча ў выніку яго размяшчэння на памежжы з Лівонскім ордэнам. Лівонскія рыцары змагаліся то на баку войск Міндоўга, то супраць іх. Знаходкі разглядаемых намі тыпаў балтоў тут датуюцца Г. Забэлай першай паловай – сярэдзінай XIII ст. [6, с. 143].

Звернемся да планіграфіі знаходак на тэрыторыі археалагічнага комплексу Пруднікі. З 41 балта, толькі 5 знойдзены на селішчы. Усе астатнія на гарадзішчы. З экзэмпляраў з гарадзішча, месца знаходкі якіх дакладна зафіксавана, 28 паходзяць з раскопак канструкцый вала. Такім чынам, відавочна, можна канстатаваць, што абсалютная большасць арбалетных балтоў патрапіла на гарадзішча ў выніку ваеннага нападу. У доказ гэтага неабходна адзначыць фактар фізічнай дэфармаванасці некаторых экзэмпляраў. Дэфармацыя чарашка ў наканечніка з'яўляецца вынікам яго баявога выкарыстання. Сярод пруднікаўскіх балтоў, чарашок пагнуты і абламаны ў 21. Чарашкі дэфармаваны толькі ў балтоў, якія паходзяць з раскопаў канструкцый валу (за выключэннем некалькіх).

Зазначым, што большасць стрэл з раскопаў валу паходзіць усяго з некалькіх кропак, а фактычна з адной групы квадратаў (В-Е/3-6 пластоў 4-7), дзе з 11 квадратаў паходзіць 20 балтоў (7 з якіх знойдзена ўсяго у двух квадратах – Г-4 і Е-3). Знаходкі 5 наканечнікаў на селішчы, жыццё на якім спынілася ў XI ст., могуць тлумачыцца тымі ж падзеямі, у выніку якіх балты патрапілі на гарадзішча. Селішча размяшчалася ля яго паўднёва-

ўсходняй падэшвы (з гэтага боку размяшчаліся валы гарадзішча). Гэтая пляцоўка добра падыходзіла для разгортвання наступу ці для абстрэлу. Абстрэл гарадзішча таксама мог весціся з-за р. Вяты з боку селішча.




Мал. 3. Планаграфія знаходак арбалетных балтоў у раскопах з канструкцыямі валу

У раскопах канструкцый вала выяўлены сляды пажарышчаў. Трэба заўважыць, што побач з арбалетнымі балтамі, тут прысутнічае шэраг наканечнікаў стрэл розных тыпаў, абсалютная большасць якіх – ланцэтападобныя. Таму можна канстатаваць, што на працягу Сярэдневякоўя гарадзішча падвяргалася нападам некалькі разоў. Што тычыцца арбалетных балтоў, складана сказаць дакладна, патрапілі яны ў напластаванні гарадзішча ў выніку аднаго нападу альбо некалькіх. Аднак, улічваючы планіграфію знаходак гэтых стрэл, іх тыпалагічную аднастайнасць, можна меркаваць, што большасць з іх апынулася тут у выніку аднаго нападу.

Складаным пытаннем з'яўляецца вызначэнне вузкіх храналагічных межаў падзей, у выніку якіх вялікая колькасць арбалетных балтоў патрапіла ў напластаванні гарадзішча Пруднікі. Культурныя слаі ўтрымліваюць матэрыялы ад ранняга жалезнага веку да XVII ст.

Больш ні на адным з помнікаў Браслаўскага Паазер'я не знойдзена значнай колькасці арбалетных балтоў. Тры наканечнікі паходзяць з гарадзішча Маскавічы (тыпы 14 і 16) [13, мал. 3:8, 9, 10]. Згодна з агульнапрынятай храналогіяй гарадзішча, жыццё на ім спыняецца ў канцы XIII ст. [5, с. 31]. Два наканечнікі (тыпы 14 і 16*) знойдзены на гарадзішчы Замкавая гара ў Браславе [1, рыс. 46:10].

Варта ўзгадаць, што пад 1244 годам Мацей Стрыйкоўскі ў сваёй хроніцы ўзгадвае пра сутычку войскаў Міндоўга з палачанамі і немцамі, недалёка ад Браслава:

*Мендог жа, убачыўшы ваяўнічую збройную сілу,*
*І спустошаныя воласці Айчыны сваёй мілай*
*З Літвы і Жамойці лепшае рыцарства сабраў*
*І харугвы асобныя з паветаў у адзінае з'яднаў*
*Вось прывёў ён іх пад возера Браслаўскае глыбокае*
*Пры якім вольна раскінулася поле шырокае,*
*Дзе шматлікія пагоркі і лагчыны стаялі гола*
*Толькі зрэдку дзе дубровы аздаблялі наваколле.*
*…*
*Параненыя енчуць, коні іржуць, грукат зброі на кожным кроку*
*Стрэлы са свістам, як дождж, з лукаў крывых вылятаюць*
*Адны з арбалетаў цэляць, а тыя з прашчы камяні выпускаюць…*
[пераклад паводле: 33, с. 74].

Нельга дакладна вызначыць, што меў на ўвазе аўтар пад крывымі лукамі. Можна дапусціць, што гэта былі складаныя лукі. Але ж галоўнае, мы бачым, што ў бойцы адначасова прымаюць удзел як ваяры з лукамі, так і арбалетчыкі. Цяжка сказаць дакладна, хто з удзельнікаў апісаных падзей, акрамя крыжакоў, яшчэ выкарыстоўваў арбалеты, але вядома, што на пачатку XIII ст. палачане яшчэ не ўзялі арбалеты на ўзбраенне. Пра гэта мы даведваемся з Хронікі Лівоніі Генрыха Латвійскага. У 1206 г. войскі князя Уладзіміра асадзілі замак Гольм. Аўтар хронікі паведамляе: *«Русские же, не знавшие арбалетов, но привычные к стрельбе из луков, бились много дней…»* [14, с. 91]. Але той жа Генрых паведамляе, 1252 г. у войску Міндоўга былі атрады арбалетчыкаў з нямецкіх саюзнікаў [10, с. 543; 16, с. 92].

Такім чынам, ужо ў сярэдзіне XIII ст. рыцары ўжо дзейнічалі ў рэгіёне Браслаўскага Паазер'я. Неабходна зазначыць, што факт знаходкі трох балтоў тыпаў 14 і 16 на гарадзішчы Маскавічы, жыццё на якім спынілася ў канцы XIII ст., прычым, хутчэй за ўсё, не з прычыны ваеннага разбурэння, з'яўляецца, напэўна, вынікам выпадковага патраплення балтоў ў напластаванні гарадзішча. Цяжка меркаваць, што жыхары гарадзішча ўжо былі ўзброены арбалетамі, але, хутчэй за ўсё, балты апынуліся тут у выніку кантактаў з рыцарамі.

Існуюць розныя пагляды на характар адносінаў паміж рыцарамі і палачанамі ў другой палове XIII – пачатку XIV ст. Выказваюцца гіпотэзы аб магчымасці сумесных дзеянняў як крыжакаў з палачанамі супраць літоўцаў, у прыватнасці супраць войск Міндоўга, так і літоўцаў у саюзе з крыжакамі. Узгадваючы прыведзены вышэй урывак з хронікі Мацея Стрыйкоўскага, зазначым, што калі б напад на Пруднікі быў здзейснены войскамі літоўцаў, у якіх, згодна з пісьмовымі крыніцамі, ў другой палове XIII ст. удзельнічалі нямецкія найміты, то ў напластаваннях гарадзішча, побач з вялікай колькасцю арбалетных балтоў, павінна была б быць не меншая калекцыя наканечнікаў стрэл лука, асабліва бранябойных. Але ж такіх наканечнікаў тут мала. Таму напад быў здзейснены непасрэдна крыжакамі.

Актывізацыя паходаў крыжакоў у глыб Полацкай зямлі прыпадае на канец XIII – пачатак XIV ст. Ёсць звесткі, што невядомы літоўскі князь, які валодаў Полацкам у апошняй трэці XIII ст., быў ахрышчаны і, не маючы нашчадкаў перадаў княства Рыжскай царкве. Пасля яго смерці Полацк перайшоў да рыцараў, але, з-за жорсткай палітыкі немцаў, мясцовыя жыхары звярнуліся за дапамогай да літоўскага князя Віценя, які выгнаў ордэнцаў у 1307 г. [2, с. 30]. Ваенныя паходы сталі рэгулярнымі з 20-х гадоў XIV ст. Пісьмова зафіксаваны такія напады на Полаччыну пад 1323, 1333, 1334 і пазней [17, с. 147]. Прысутнасць рыцараў у гарадах Полацкай зямлі, дарэчы, пацвярджаецца і знаходкамі арбалетных стрэл. Балты тыпаў 14 і 15 ёсць у Лукомлі [72, рыс. 45:27], дзе ў 1386 г. знаходзіліся немцы, на Верхнім Замку Полацка [71, рыс. 30:7]. Магчыма, усё ж, крыжакам належалі балты з Запалоцця, знойдзеныя пад час раскопак М.В. Клімава [12, мал. 2:5, 6].

Улічваючы марфалогію балтоў з Прудніка, планіграфію іх знаходак, звесткі пісьмовых крыніц, якія адлюстроўваюць актывізацыю дзейнасці крыжакоў з сярэдзіны XIII ст., можна даволі ўпэўнена меркаваць, што адзін з такіх паходаў рыцараў мог не абмінуць Пруднікаўскага гарадзішча. Адбыўся гэты паход, верагодней за ўсё, паміж сярэдзінай XIII – сярэдзінай XIV ст. Магчыма далейшыя даследаванні на помніку дазволяць казаць больш канкрэтна, альбо карэктаваць прапанаванае меркаванне.

ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев, Л.В. Раскопки древнего Браслава / Л.В. Алексеев // Краткие сообщения института археологии. – 1960. – Вып. 81. – С. 95 – 106.
2. Варонін, В.А. Падзеі 1307 года ў Полацку: спроба крытычнага разбору / В.А. Варонін // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (24 – 25 кастрычніка 2007 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2009. – С. 30 – 40.
3. Герберштейн Сизизмунд. Московия / Сигизмунд Герберштейн; пер. А.И Малесина и А.В. Назаренко; коммент. З. Ножниковой. – М.:АСТ, Владимир, 2008. – 703 с.
4. Гурэвіч, Ф.Д. Летапісны Навагрудак / Ф.Д. Гурэвіч. – Спб. – Наваградак, 2003. – 324 с.
5. Дучыц, Л.У. Браслаўскае Паазер'е ў IX – XIV стст.: Гісторыка-археалагічны нарыс / Л.У. Дучыц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 120 с.
6. Забелла, Г. Городище Шяйминишкеляй – предполагаемое место замка Ворута / Г. Забелла. // Castrum, urbis et bellum. Зборнік навуковых прац. – Баранавічы: Баранав. Узбуйн друк., 2002. – С. 131 – 145.
7. Загорульский, Э.М. Возникновение Минска / Э.М. Загорульский. – Мн.: Издательство БГУ, 1982. – 358 с.
8. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А. Заяц. – Минск: Навука і тэхніка, 1995. – 207 с.
9. Зверуго, Я.Г. Верхнее Понеманье в IX – XIII вв. / Я.Г. Зверуго. – Минск: Навука і тэхніка, 1989. – 208 с.
10. Ипатьевская летопись / Полное собрание русских летописей. Том второй. – М.: «Языки русской культуры», 1998. – 648 с.
11. Кирпичников, А.Н. Военное дело на Руси XIII – XV вв. / А.Н. Кирпичников. – Ленинград: Наука, 1976. – 136 с.
12. Клімаў М.В. Новыя звесткі аб раскопках запалоцкага пасада г. Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) / М.В. Клімаў. // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, 22 – 23 кастр. 2009 г. , Віцебск / рэдкал. Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 39 – 48
13. Ласкавы, Г.В. Узбраенне воінаў XII – XIII стст. з феадальных сядзіб-замкаў паўночнага захаду Полацкай зямлі (па матэрыялах раскопак гарадзішчаў Пруднікі і Маскавічы) / Г.В. Ласкавы. // Старонкі гісторыі Беларусі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – С. 47 – 57.
14. Латвийский, Генрих. Хроника Ливонии / Генрих Латвийский. – Введение, перевод и комментарии С.А. Анненского. 2-е издание. – М. – Л.: Изд. Акад. Наук. СССР, 1938. – 351 с.
15. Лысенко, П.Ф. Берестье / П.Ф. Лысенко. – Минск.: Наука и техника, 1985. – 399 с.
16. Медведев, А.Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) VIII–XIV вв. / А.Ф. Медведев. // САИ. – Вып. Е1 – 36. – М.: Наука, 1966. – 184 с.
17. Сагановіч, Г.М. Полацк і Нямецкі ордэн: ад вайны да васалітэта і саюза / Г.М. Сагановіч. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Матэрыялы V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (24 – 25 кастрычніка 2007 г.). – Полацк: НПГКМЗ, 2009. – С. 144 – 151.
18. Шадыра, В.І. Справаздача аб раскопках гарадзішча «Замак» каля в. Пруднікі Міёрскага р-на Віцебской вобл. / В.І. Шадыра. – Мінск, 1994. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1484.
19. Шадыра, В.І., Справаздача аб раскопках гарадзішча Пруднікі Міёрскага раёна і Клішана Крупскага раёна ў 1999 годзе / В.І. Шадыра. – Мінск, 2000. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1793.
20. Шадыра, В.І. Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н.э.) / В.І. Шадыра. – Мінск: ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2006. – 150 с.
21. Шадыро, В.И. Отчет о раскопках селища и городища близ д. Прудники Миорского района Витебской области (зона затопления Даугавпилской ГЭС) в 1986 году / В.И. Шадыро. – Минск, 1987. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 951.
22. Шадыро, В.И. Отчет о раскопках городища и селища близ д. Прудники Миорского р-на в 1987 г. / В.И. Шадыро. – Минск, 1988. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1013.
23. Шадыро, В.И. Отчет о полевых исследованиях в Городокском и Миорском районах Витебской области в 1988 г. / В.И. Шадыро. – Минск, 1989. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1090.
24. Шадыро, В.И. Отчет о полевых исследованиях в Миорском и Глубокском р-нах Витебской обл. в 1989 году. В.И. Шадыро. – Минск, 1990. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1138.
25. Шадыро В.И. Отчет о раскопках в Глубокском, Миорском и Браславском р-нах Витебской обл. в 1990 г. / В.И. Шадыро. – Минск, 1991. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1206.
26. Шадыро, В.И. Средневековые материалы из городища Прудники / В.И. Шадыро // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 138 – 146.

27. Шадыро, В.И., Ласкавый, Г.В. Средневековые наконечники стрел лука и арбалета из поселения у д. Прудники / В.И Шадыро, Г.В. Ласкавый // ГАЗ. – 1994. – № 4. – С. 217 – 224.
28. Шадыро, В.И. Отчет о раскопках селища близ д. Прудники Миорского р-на Витебской обл. в 1997 г. / В.И. Шадыро. – Минск, 1998. – АА ІГ НАН Беларусі. Спр. № 1717.
29. Шадыро, В.И. Городище и селище Прудники / В.И. Шадыра // Lietuvos archeologija. – 2001. Т. 21. – С. 267 – 274.
30. Шноре, Э.Д. Асотское городище / Э.Д. Шноре // Материалы и исследования по археологии Латвийской ССР. – Рига, 1961. – Т. II.
31. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.
32. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX – XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1978. – 160 с.
33. Шыдлоўскі К. Браслаўшчына на старонках летапісаў. Дакументальныя крыніцы XV – XVII ст. / К. Шыдлоўскі // Памяць: Гіст. дакум. хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск: «Паліграфафармленне», 1998. – С. 69 – 97.
34. Hedemann, O. Historia powiatu Braslawskiego / O. Hedemann. – Wilno, 1930. – 462 s., rуc.
35. Rackevičius, G. Arbaletas ir lankas Lietuvoe XIII – XVI a. / G. Rackevičius. – Vilnius: pilių tyrimo centras «Lietuvos pilys», 2002. – 296 p., iliustr.
36. Stryjkowski, M. O poczatkach, wywodah, dzielnosciach, Sprawach rycerskich i domowych slawnego narody litewskiego, zemojdzkiego i ruskiego / M. Stryjkowsi. – Warszawa, 1978.
37. Vilcāne, A. Senā Jersika / A. Vilcāne. – Rīga: Latvijas vēstures institūta apgāds, 2004. – 1151 pp., iliustr.

## ОБ ОХОТЕ И ЖИВОТНОВОДСТВЕ НАСЕЛЕНИЯ КРИВИНСКОГО ТОРФЯНИКА В НЕОЛИТЕ И РАННЕМ БРОНЗОВОМ ВЕКЕ

***А.А. РАЗЛУЦКАЯ***
***(Институт истории НАН Беларуси, Минск)***

**Введение.** Источники для реконструкции охоты и животноводства в неолите и бронзовом веке Подвинья Беларуси во многом связаны с изучением Кривинского торфяника в Витебской области. В 1934 г. К.М. Поликарповичем и А.Д. Коваленей были проведены первые раскопки поселения Кривина 1, которые дали богатый биоархеологический материал, в том числе костные остатки животных или археозоологические коллекции [15, с. 44 – 46]. В 1959 – 1963 гг. изучение стоянок Кривина-1, 2 проводили А.Г. Галанова (Красковская) и П.А. Прибыткин, с 1966 г. по настоящее время на стоянках Асовец-2,4 ведет стационарные исследования М.М. Чернявский, в 80-е годы – Э.М. Зайковский проводил раскопки на стоянке Кривина 3 [7, с. 29; 8, с. 82 – 88], с 2000 г. на стоянке Асовец-7 ежегодно работает М.М. Чернявский, с 2010 г. начал исследовать и поселепие 2.

В 1966 г. М.М. Чернявским в северной части торфяника, к юго-востоку от д. Асовец Бешенковичского района, в урочище Дражня открыто обширное поселение Асовец-2 с культурным слоем, изобилующим костными остатками, мощностью до 1,2 м. На памятнике раскопами вскрыто более 320 кв.м. Площадь археологического объекта более 2 тыс. кв.м. Изначально местообитание было основано населением поздненарвенской (усвятской) культуры неолита. В дальнейшем поселение расширялось и в позднем неолите – раннем бронзовом веке здесь были носители северо-белорусской культуры, в целом жизнь на этом месте не затихала более 500 лет [25, с. 190 – 205; 26, 311 – 329; 24, с. 13].

В 2000 г. в 300 м юго-восточнее стоянки Асовец-2 у мелиоративных каналов М.М. Чернявским была открыта стоянка северо-белорусской культуры Асовец-7. Ежегодные исследования поселения единой площадью, которые ведет М.М. Чернявский, также дают репрезентативный костный материал (в том числе остатки людей).

**Материал и методика**. Фауну стоянки Асовец-2 изучали В.И. Бибикова (Зубарева) – 740 экз. (1972 г.), В.В. Щеглова – 423 экз. [33, р. 194; 28, с. 444 – 447], в последние годы, хранящиеся в археологических фондах, и новые материалы раскопок Кривинских стоянок исследует автор, результаты определений были опубликованы частично или тезисно [17 – 19; 31, s. 89 – 92; 34, с. 299 – 313]. Определение остатков птиц 1966 – 1992 гг. (696 экз.) выполнено Е.Е. Антипиной в Институте археологии РАН, к печати данные по авифауне подготовлены автором (табл. 1).

Видовой состав столь обширной коллекции костей птиц из раскопок памятника неолита и бронзового века Беларуси публикуется впервые, поэтому мы считаем не лишним показать послойное распределение остатков.